ЦЭНТАЎ 10 CENTS

БЕЛАРУС

Выдае:
Беларуска - Амэрыканскае Задзіночаньне у З. Г. А.
Рэдагуе Рэд. Калегія
Падпіска на год: — 2 дал.
Цана паасобніка — 10 ц.

Editor - in - Chief
~~Mag.~~ L. Halak
325 East 100 Str., Apt. 9.
NEW YORK 29. N. Y.
Subscription per year $ 2.00.
Per copy — 10 c.

ЧАСАПІС БЕЛАРУСАЎ У З. Г. А. BYELARUS — BYELORUSSIAN NEWSPAPER IN THE U.S.A.

Год I, № 1 20 верасьня, 1950 NEW YORK 29, N. Y. U. S. A. Sept. 20, 1950. Vol. I. № 1.

Ад Рэдакцыі

Пачынаючы выдаваньне часапісу "Беларус", рэдакцыя хоча выказаць паважанаму чытачу тыя прычыны, што спанукнулі нас да гэтага; што сабою прадстаўляюць ініцыятары выдаваньня і якія яны сабе стаўляюць заданьні.

У сваім прадстаўленьні будзем шчырыя, бо зварочуемся да сваіх суродзічаў, як беларусы да беларусаў, як брат да брата.

Найперш хто мы такія? Вось жа выдаўцы гэтае газэты зьяўляюцца ў пераважнай бальшыні новымі эмігрантамі, што пакінулі Беларусь 6-11 год назад, людзі што перажылі тры, а некаторыя і пяць чужых акупацыйных рэжымаў: расейска-царскі, нямецка - кайзэраўскі, польскі, расейска-бальшавіцкі і нямецка-гітлераўскі.

Жывучы разам із беларускім народам, падзяляючы ягоную горкую долю, што чужнікі акупанты прыносілі нам адзін аднаму на зьмену, мы [illegible] жывыя сьветкі [illegible] фільму разбою, [illegible] усіх акупан-

Дзеля таго што беларускі народ, нагледзеўшыся собскімі вачыма на ўсе махінацыі акупантаў, пачаў у 1917 годзе зацятую і бяскампрамісовую барацьбу за волю свайго краю, за сваё незалежнае гаспадарства, дык і нам, як складовай частцы беларускага народу, давялося браць дзейны удзел у гэтых змаганьнях з чужымі наезьнікамі. Мала знойдзецца сярод нас, новых эмігрантаў, людзёў каму-б нехта зь пералічаных акупантаў не спаліў ягонай хаты, не забіў кагось із ягонай сям'і, роднага ці знаёмага. У нашых вачох мігацяць яшчэ сьвежыя абразы пажарышчаў, доўгія канвоі нявольнікаў на этапах у Калыму або Сібір. Разьздіраюць болем сэрца ўспаміны стогнаў, плачу матак і енку дзяцей. Апынуўшыся сягоньня на вольнай зямлі Вашынгтона, нам цяжка забыцца цяпэр аб усім тым, што дзеецца ў Беларусі.

Дзеля таго хочацца крыкнуць із гэтага вольнага краю, каб увесь шчасьлівы сьвет пачуў і пазнаў аб нас праўду, каб памог беларускаму народу ў ягонай барацьбе за ягоныя людзкія правы, а найперш, каб гэты вольны сьвет нас зразумеў.

Такая вось першая прычына, што спанукнула нас да выдаваньня беларускага часапісу, як голасу вольнай часткі беларускага народу.

Другой прычынай гэтаму было тое, што пераглядаючы амэрыканскую статыстыку за 1948 год, мы даведаліся, што ў З. Г. А. выходзіць 973 часапісы ў 40 розных (не ангельскіх) мовах. Праз гэтыя выдавецтвы 40 розных народаў прыбылых у Амэрыку падтрымлеваюць духовую сувязь із сваімі старымі Бацькаўшчынамі, прыносячы гэтым вялікую карысьць як самым сабе, так і сваім краём, ды Амэрыцы і агульна людзкой культуры.

Сярод гэных часапісаў розных народаў мы не знайшлі нажаль ніводнага беларускага часапісу! Чаму-ж гэта? Ці ў Амэрыцы зусім няма беларусаў? Ці мо іх тут замала? О не! У Амэрыцы ёсьць больш памільёну людзеў, у жылах якіх цячэць беларуская кроў, а людзёў, што гутараць яшчэ пабеларуску каля 200.000. Дзеля гэтага напрошуецца пытаньне, чаму беларусы ў Амэрыцы засталіся так далёка ззаду. Дасьледаваньнік - чужнік слаба абзнаёмлены з гісторыяй беларускага народу бязсумлеву зробіць адзін із двух вывадаў: беларусы гэта не народ, або што народ гэты яшчэ на найніжшай ступені свайго культурнага разьвіцьця і таму як калёніяльны народ карыстае з прэсы сваіх акупантаў.

Чужнік лепш асьведамлены — вучоны, які ведае мінуласьці беларускага народу, і ведаючы, [illegible] ужо у [illegible] народам на ўсходзе Эўропы і што ад беларусаў вучыліся ўсе ягоныя суседзі, зробіць вывад, што беларуская эміграцыя ў З. Г. А. гэта найгоршая частка беларускага народу, што выракалася свае мовы, свайго народу, прыстаючы да ўсіх, каму куды лучыла, а аб сваім народзе і аб ягоных вызвольных імкненьнях і слухаць ня хочуць! — Такая думка чужнікова аб беларускай эміграцыі ў З. Г. А. была-б няправільнай і крыўднай, такая ацэна была-б вельмі павярхоўная.

Нам добра ведама, што гэтая поўмільённая маса беларускай эміграцыі ня такая ўжо беспачуцьцёвая і што свае матчынае мовы яны ня толькі ня выракліся, але моцна ее трымаюцца і захавалі яе ня маючы ані арганізацыяў, ані газэтаў. Ня маюць яны іх таму, што гэтая поўмільённая беларуская эміграцыя пакінула Бацькаўшчыну зусім у іншых абставінах, чымсе пакідалі свае бацькаўшчыны эміграцыі іншых народаў. Нашая старая эміграцыя пакінула Беларусь у часе трываньня найцямнейшага пэрыёду нашае гісторыі, калі ўсё беларускае было стаптанае, зьнішчанае, засьмеянае. Нашая старая эміграцыя апынулася ў Амэрыцы, як працоўная, малапісьменная ці зусім няпісьменная маса, не магла, ведама, заняцца нейкай творчай, культурнай і арганізацыйнай працай. Хітры-ж вораг, каб гэтыя людзі і на чужыне не агледзіліся, адразу ўсьлед за імі паслаў цэлыя кадры сваіх "просветителей", заданьнем якіх было утрымаць і далей гэныя беларускія масы у сваіх руках. Беларуская інтэлігенцыя было ўтой час яшчэ замала. Яе не хапала навват для краю, каб весьці там цяжкое змаганьне з акупантам. Гэтак вось спэцыфічныя гістарычныя абставіны і прычыніліся да таго, што беларуская эміграцыя у З. Г. А. засталася у поўнай ізаляцыі ад беларускай культурна-творчай і палітычна-вызвольнай працы ў краі. Цяпер стварыліся зусім іншыя абставіны. Дарма што акупацыйны рэжым у Беларусі, беларускі народ у краі энэргічна размахнуўся у творчасьці свае нацыянальнае культуры, скрысталізаваў свае палітычныя пагляды і із стрэльбаю зь лесу абараняе гэта ўсё ад сучаснага акупанта. Вялікая колькасьць беларускай інтэлігенцыі, што выйшла із сялянскіх гушчаў і вывараная ў цяжкім змаганьні пад рознымі акупацыямі — аказалася ў выніку створаных абставінаў таксама ў Амэрыцы.

Беларуская старая эміграцыя атрымала цяпер у васобе гэтае новае эміграцыі вялікую сабе падмогу. Каб выйсьці цяпер у шырокі сьвет, каб стаць у вадзін шэраг зь іншымі ў З. Г. А., засталося толькі [illegible] кі старой і новай эміграцыі ды йсьці тым сьвятым беларускім шляхам, прызначаным нам Богам, на які стаў ужо ўвесь Беларускі народ у краі — шляхам да Вольнай і Незалежнай Беларускай Народнай Рэспублікі.

Рукою гэтай, якую працягвае новая беларуская эміграцыя да старой і ёсьць наш часапіс — БЕЛАРУС.

Найважнейшай аднак прычынай, што спанукнула нас да выдаваньня газэты — гэта неабходнасьць інфармаваць увесь цывілізаваны сьвет аб падзеях у Беларусі, высьвятляючы праўду аб імкненьнях і ідэалах Беларускага Народу ў ягоным змаганьні з акупантам, ды змагацца у усёй той маною, хвалшам і баламуцтвам нашых ворагоў, якую яны сеюць праз сваю прэсу сярод нашых людзёў у Амэрыцы.

Рэдакцыя

АФЭНЗЫВА ЗАДЗІНОЧАНЫХ НАЦЫЯЎ У КАРЭІ

15 верасьня г. г. сілы Задзіночаных Нацыяў правялі інвазыю ў Карэі. 40 тысяч войскаў З. Н. высадзіліся ў порце Інчан на заходнім берагу паўвоўстрава і пасьля ліквідацыі слабага камуністычнага апору, дайшлі да Сэул. Сяньня сталіца паўдзённай Карэі Сэул знайходзіцца ў руках сілаў З. Н. Макартур сам даводзіў апэрацыямі інвазыі.

Сілы З. Н. маюць намер камплетна адрэзаць камуністычную армію ад базаў дастаўы.

175 міляў на поўдзень камуністычныя арміі адступаюць на цэлым фронце.

ДВА БЕЛАРУСКІЯ КАТЫНЫ

БАЛЬШАВІЦКІЯ ТЫРАНЫ РАСТРАЛЯЛІ ПАТАЕМНА 13.325 НЯВІННЫХ НІ Ў ЧЫМ БЕЛАРУСАЎ. САКРЭТНЫ ДАКУМЭНТ АБ ГЭТЫХ РАСТРЭЛАХ У РУКОХ УРАДУ БНР.

Толькішто вышла з друку кніжка ў ангельскай мове, аўтарам якой зьяўляецца прэз. М. Абрамчык, пад загалоўкам: АБВІНАВАЧЫВАЮ КРЭМЛЬ У ЗАБОЙСТВЕ МАЙГО НАРОДУ, дзе прыведзены сакрэтныя дакумэнты савецкай пракуратуры і НКВД, у якіх самі бальшавікі прызнаюцца штё растрэлівалі ні ў чым невінаватых людзей. У гэтых сакрэтных бальшавіцкіх дакумэнтах пералічваюцца факты і прозьвішчы ахвяр катаў.

Прэз. Абрамчык у сваей прадмове горача заклікае увесь цывілізаваны сьвет да абароны беларускага народу.

А МЫ КЛІЧЫМ ВАС, ЭМІГРАНТЫ БЕЛАРУСЫ! ПРАВЯСЬЦІ ЭНЕРГІЧНА АКЦЫЮ ПРАТЭСТУ СУПРОЦЬ ДЗІКІХ ТЫРАНАЎ МАСКВЫ.

Арганізуйце пратэстацыйныя мітынгі, пішыце да А. З. Н., дамагайцеся суду для маскоўскіх катаў. Прасіце помачы і абароны Беларускага Народу!

Калі маскоўскія каты выкруціліся ад суду за замардаваньне польскіх ахвіцэраў у Катыні, зваліваючы віну на немцаў, дык ад 2-х беларускіх Катынаў, яны выкруціцца ня змогуць, бо сакрэтныя бальшавіцкія дакумэнты аб растрэлах знайходзяцца ў рукох Ураду БНР.

Не заставайцеся толькі пасыўнымі, бо-ж то кроў і мукі замардаваных 13.325 нашых братоў нас кліча да акцыі!

Пратэстуйце, пішыце да АЗН. Далучайце да гэтага заўседы кніжку прэз. Абрамчыка.

Пашырайце гэтую кніжку ўсюды, дзе толькі зможыце, сярод чужынцаў. Зьбірайце за яе грошы, каб пакрыць выдавецкі доўг, ды выдаць яе больш, а ў тым ліку і пабеларуску.

МАЎЧАЦЬ НЯ СЬМЕЕМ! Кожны беларус павінен набыць некалькі такіх кніжак і пашыраць іх. Шырокі сьвет нас тады [illegible] зразумее, хутчэй прыдзе нам на помач. [illegible]

[illegible] Кніжку можна замаўляць у [illegible] ЗБК ў Торонто і ў Управе Беларускага Задзіночаньня у Амэрыцы. Цана 50 ц. У іншых краінах кніжку можна дастаць у управах беларускіх цэнтральных арганізацыяў.

БЕЛАРУСКІ ВЫЗВОЛЬНЫ РУХ — ЗЬЯВА ПРЫРОДНА — БОСКІХ ЗАКОНАЎ

Із прамовы прэз. Абрамчыка на банкеце у Чыкаго.

Кожнае зьявішча у сьвеце, што даецца спасьцерагчы людзкому воку ёсьць нічым іншым, як толькі вонкавым выявам тае нутраное сілы, якую мы называем прыродна — Боскімі законамі.

Чалавечы розум не заўседы усьведамляе гэныя прычынныя залежнасьці вонкавых зьяваў ад нутраных прыродна — Боскіх законаў. Гэта не азначае аднак, што гэных законаў няма, што вонкавыя праявы зьяўляюцца самыя па сабе, бы штось прыпадковае.

Навука згодная ў тым, што прыпадковасьці ў сьвеце не існуе. З гэтага вынікае, што і усялякія трывалыя зьявы, як у жыцьці прыроды, так і ў грамадзка людзкіх суадносінах кіруюцца сіламі прыродна - Боскага закону, дзеля гэтага мы ня можам пазбавіцца гэных праяваў, ані ня можам іх спыніць. Так мы ня можам спыніць паданьня сьнегу узімку, даждж улетку, росту дрэваў, расьлінаў, затрымаць плынь рэк, бо ўсё гэта толькі вонкавыя праявы, якія узалежненыя ад нутраной сілы закону, а не ад волі чалавека.

Беларускі нацыянальна - вызвольны рух, як зьявішча грамадзкага парадку, таксама узалежнены ад тае нутраное сілы, што тоіцца у прыроднай апрычонасьці характару нашага народу. Гэтыя прыродныя нашыя апрычонасьці вырозьніваючы нас ад іншых народаў у асобную нацыю і кіруюць нашыя імкненьні па лініі закону самазахаваньня жыцьця нацыі, інакш захаваньня тагс чым мы, як нацыя, абдорані прыродаю.

Наш пачатковы нацыянальна-адраджэнскі рух, які пачаўся быццам із змаганьня за родную мову, ня меў аднак толькі гэную адну прычыну — мову. Беларус ня толькі гаворыць мовай іншай ад мовы нашых суседзяў, але інакш жыве цэлай істотай свайго нутранога псыхічнага жыцьця. Ен інакш думае, інакш разважае пры сваёй духова творчай працы. Дзеля гэтага і ўсе вонкавыя праявы гэтага духовага творства беларуса зьяўляюцца іншымі. Іншай зьяўляецца ягоная архітэктура, філёзофія, музыка і мастацтва ў усіх формах. Гэтыя асаблівасьці выяўляюцца у такой яскравай форме, што ніхто з пасярод разумных людзёў ня можа гэтаму запярэчыць.

Такое зьявішча не магло стацца з прычынаў нейкага капрызу беларускага народу — ёй рухае толькі тая нутраная сіла, сіла таямнічая, незалежная ад волі самых адзінак, што складаюць гэтую суцэльнасьць — беларускі народ.

Гэтая нутраная таямнічая сіла закону апрычонай псыхік беларускага народу і сть

(Працяг на бал. 2-й

БЕЛАРУСКІ ВЫЗВОЛЬНЫ РУХ — ЗЬЯВА ПРЫРОДНА — БОСКІХ ЗАКОНАЎ

(Працяг з бал. 1-й)

ла той рух змаганьня за самастойнае жыцьцё, як народу, у ва ўсіх ягоных праявах, у тым ліку і гаспадарча палітычнага жыцьця. Трываласьць гэтага змаганьня сягае ад нашых дзён так далёка у прошласьць, як сягае туды нашая веда.

Гісторыя даводзіць, што беларускія плямёны, калісь яшчэ ня зусім задзіночаныя, заўсёды лучыліся для супольнай абароны, калі іншыя суседнія ім чужыя плямёны, мелі намер падпарадкаваць іх сабе.

У пачатку 13-га стагодзьдзя, калі вонкавая небясьпека для беларускіх плямёнаў зрабілася асабліва грознай — паўстае магутная беларуская дзяржава — Літва, якая дае адпор захопніцкім намерам усіх сваіх суседзяў. Гэная дзяржава трывала каля 500 гадоў і на працягу гэнага часу беларускі народ фанатычна змагаўся за свае сувэрэнныя правы.

Калі зляжыць усе гады, калі беларускі народ знаходзіўся у стане войнаў, дык атрымаем іх каля 2 сотняў. Тры чверці гэных гадоў, пры тым гадоў найбольш крывавых, прыпадае на войны з Маскоўшчынай, а потым Расеяй.

Пасьля упадку дзяржаўнай незалежнасьці, беларускі народ, хоць часамі навонкі і выглядала, што быццам ён зьмірыўся з лёсам і з чужацкімі парадкамі, нутрана ён аднак з такім станам зьмірыцца ня мог і рэагаваў.

Ен не прапусьціў ніводнае спрыяючай яму вонкавай аказі[illegible], каб не спрабаваць скінуць з[illegible]е чужацкую няволю. Гэ[illegible]так беларусы хапаюцца за саюз са швэдамі падчас вайны апошніх з Польшчай і Расеяй, за саюз з Напалеонам падчас ягонага паходу на Маскву. Прабуюць і выключна сваімі сіламі скінуць расейскае ярмо паўстаньнем Каліноўскага як і безьліччу іншых неарганізаваных стыхійных народных бунтаў.

Ад 1917 году да нашых дзён беларускі народ з асаблівай яскравасьцяй паказаў цэламу сьвету несьмяротнасьць сваіх імкненьняў да самастойнага культурнага і дзяржаўнага жыцьця.

У 1917-1918 г. беларускі народ ня гледзячы на асабліва не прыяльныя для яго абставіны здолеў аднак аформіцца ў самастойную дзяржаву — Беларускую Народную Рэспубліку і дабіцца яе прызнаньня дэ юрэ 12-цю сувэрэннымі дзяржавамі і прызнаньня дэ факто бальшыньёй народаў сьвету.

Як ацанілі тады гэтую нутраную сілу беларускага народу здальнейшыя адзінкі культурна-палітычнага сьвету — відаць па адносінах прэзыдэнта Чэха-Славацкае Рэспублікі Тамаша Г. Масарыка, які маючы славу найвялікшага палітыка і вучонага сацыёлёга таго часу — прызнаваў Беларусь дэ юрэ аж да 1928 году. Нажаль іншы цывілізаваны сьвет заняўшы тады да нас становішча пасыўнага назіральніка, дапамог гэтым самым нашым ворагам разьбіць маладую беларускую дзяржаву. Цяпер аднак і гэты далёкі ад нас сьвет пабачыў свае памылкі, бо пабачыў тые цуды нутранае сілы беларускага народу — сілы закону [illegible]гоных прыродных свомась[illegible]. А цуда гэтае выявілася у тым, што беларускі народ страціўшы сваю дзяржаву у 1920 годзе дэ факто, утрымаў яе дэ юрэ.

32 гады беларускі народ няўпынна вядучы крывавае змаганьне з усімі наезьнікамі на ягоную тэрыторыю і падлягаючы гэтым наезьнікам дэ факто, ніколі аднак не прызнаваў іх дэ юрэ. Дэ юрэ ён прызнаваў і прызнае толькі сваю адзіную законную ўладу — Раду і Урад Б. Н. Р., якой ён даў у 1918 годзе сваё неабмежаваныя паўнамоцтвы і лёяльнасьць якой ён што год дэманструе ўрачыстымі абходзінамі таго найвялікшага дня, у якім была рэстаўравана ягоная сувэрэннасьць.

Гэты дзень 25 Сакавіка абходзіцца няўпынна, вось ужо 32 гады і кожны год сьвята гэтае ня толькі ня губляе сілы энтузыязму, але штораз больш умацоўвае беларускі народ у веры ў ажыцьцяўленьне абвешчанай незалежнасьці і дэ факто. Побач з гэтым на працягу 32 гадоў беларускі народ у сілу тых нутраных, прыроджаных яму законаў, заўсёды адкідаў і адкідае усялякія падстаўляныя яму акупантамі эрзац-урады.

Часамі беларускі народ з уласьцівай яму разважлівасьцяй моўчкі прыглядаецца на усялякія агентурныя экспазытуры, прадстаўляныя яму, як ягоныя урады, але разгледзеўшыся у іх, ці вычуўшы у іх сваёй прыроджанай інтуіцыяй чужое, з агідаю адварачываўся ад іх і скіроўваў свой узрок да свайго законнага ураду — Б. Н. Р.

Да гэтай законнай улады што раз больш уважна пачаў прыглядац[illegible] вонкавы палітычны сьвет. Беларускі народ перажыўшы ужо некалькі акупантаў, бязсумліву перажыве і акупанта бальшавіцка-расейскага. Бальшавіцкая тыранія, як твор расейскі не прыймаецца беларускім народам. Сіла прыроднага закону, як сіла Божая ёсьць неперам[о]жная і гэтая сіла мусіць немінуча прывесьці беларускі народ да [illegible]най поўнай дзяржаўнай незалежнасьці. Гэтак станецца і толькі гэтак. Супроць сілы боскага закону нельга утрымацца. Штучнае мусіць зьгінуць і даць дарогу для разьвіцьця прыродна-Боскаму.

КАМУНІЗМ І РАСЕЙЦЫ

Ю. Балатоўскі піша ў газэце "Новае Русское Слово", нумар 13796, пра рэфэрат праф. М. Карповіча, што гэты маў для расейскай эміграцыі ў Парыжы.

Карповіч доўга даводзіў, што камунізм не вынікае з расійскай гісторыі, але ў канцы мусіў часткава прызнаць, што дыкжэ вынікае. Ен сказаў (перадаём за Балатоўскім із малымі скарачэньнямі), што некаторае карэньне бальшавізму ёсьцека ў расейскай гістарычнай мінуласьці. Найпершыя зародкі гэных тэндэнцыяў бальшавізму адкрываюцца ў залежнасьці культуры ад палітыкі, што было закладзена ў расейскім нігілізме 60-тых год. У апошнія гады нават у Бялінскага пачала праяўляцца перавага палітыкі над культураю. У яшчэ большай меры назіраецца гэта ў Чарнышэўскага, што між іншага зрабіў вялікі ўплыў на Леніна. Ягоны паход супроць ідэалістычных кірункаў прывёў частку расейскай інтэлігенцыі да палітычна-ўтылітарнага падыходу да літаратуры. Гэты падыход лучыўся ў Чарнышэўскага й Пісарава з псыхалегічным элемэнтам фанатызму й нетолеранцыі. Пад іхным уплывам разьвілася нават, як-бы ціхая радыкальная цэнзура, што крыўдзіла Тургенева, Цютчава, Фета, а асабліва Лескова, каторым часта зачынялі дарогу з прычыны не адказаваньня іхных твораў так званаму "соцыяльнаму заказу". І ня прыпадкам Чарнышэўскага й Пісарава так высака цэняць цяпер бальшавікі.

Ткачоў і Нячаеў ішлі яшчэ далей. Яны ўважалі, што ў палітыцы ўсі сяродкі добрыя, каб асягнуць мэту. Яны-ж вызнавалі і захапленьне ўлады сілаю і дыктатуру.

Гэтая аднак сувязь бальшавізму з расейскай мінуласьцяй адыходзіць на другі плян перад іншым, шмат цяжшым грэхам дарэвалюцыйнай расейскай інтэлігенцыі — перад максымалізмам. Максымалізм тут не абмежуецца адно палітычнай рэвалюцыяй. Ен абымае усё чыста. Гэрцэн і Бакунін жадалі рэвалюцыі максымальнай ува ўсіх галінах: у царкве, маральнасьці, радзімных дачыненьнях, каб не засталося каменя на камені ад старога сьвету. Нат Вялікая Француская Рэвалюцыя здавалася Гэрцэну толькі зьверхнім эпізодам.

У 80-тых гадох Расейцы абвінавацілі Захад у мяшчансьцьве. Разьвіваеецца ўлегцыменьне да так званых "малых справаў" (як закладаньне лячэльняў і школаў), праяўляецца грэбаваньне да фармальна-праўных, вякамі выробленых нормаў права і зарукаў вольнасьці і правоў асабістасьці.

Гэтулькі Карповіч, што побач із Керанскім стаіць у Амэрыцы на чале расейскага палітычнага кірунку непадзельнасьці Расеі. Прызнаць, што бальшавізм ё творам чыста маскоўскім, значыць вы[illegible]рці да расейскую турму народаў. Дзеля гэтага прыхільнікі ўдзяржаньня гэнае турмы народаў стараюцца, сьведама ці нясьведама, абмежыць расейскае карэньне бальшавізму. А тымчасам, апрача расейскага, іншага карэньня ў ім нямашака.

Расейскае карэньне, дый ці толькі карэньне, у бальшавізьме спрадвечнага паходжаньня, яшчэ з XII стагодзьдзя; умацавалася яно і ўдасканалілася пад татарскім ярмом, зыркім цьветам расьцьвіло за Івана Грознага, Аляксея Міхайлавіча й Пётры I, у XIX і пачатку XX стагодзьдзя пакрылася эўрапэйскім пакостам, але ён быў змыты рэвалюцыяй і цяпер стаіць перад намі расеец, якім ён быў і есьць.

А што да немаральнасьці, непераборлівасьці ў сяродках у палітыцы, або часьцей у палітыкансьцьве, дык гэтым адзначаюцца і расейскія янычары, паміж іншымі і беларускага паходжаньня, або, накш кажучы, так званыя зарубежнікі. Кажны з гэтым згодзіцца, хто хоць крыху стыкнуўся зь іхнай, ведзенай чыста бальшавіцкім спосабам, бруднай агітацыяй.

БЕЛАРУСКІЯ ПАРТЫЗАНЫ НА ВУЛІЦАХ ВІЛЬНІ

Нямецкая газэта "Ноес Тагеблят" у нумары 136 паведамляе, што нядаўна ў Вільні адбыўся 4-хгадзінны бой паміж адзьдзеламі беларускіх партызанаў "Чорнага Ката" з бальшавіцкай паліцыяй.

Бальшавікі мусілі ўжыць танкаў, каб выціснуць беларускіх партызанаў зь гістарычнае сталіцы Беларусі.

ДА ВЕДАМА БЕЛАРУСКІХ ВАЙСКОЎЦАЎ

Падаецца да ведама усіх беларускіх вайскоўцаў, шт[illegible] лоўны ўрад Задзіночань[illegible] беларускіх Вэтэранаў пе[illegible]ў [illegible] Зоны Нямеччыны у Злучаныя Дзяржавы Амэрыкі і пачаў урадаваньне у Ню Ерку. Адрэс Задзіночаньня наступны:

325 East 100 Str., Apt. 9.
NEW YORK 29, N. Y. U. S. A.

Ф. Кушэль

НАТУРАЛЬНЫ КАУЧУК У БЕЛАРУСІ

Каучук — гэта цудоўны матар'ял сучаснасьці. Колькі рознага роду хатніх рэчаў, вопраткі, абутку і іншага выробляецца з гэтага матар'ялу. Мы ўжо так прывыклі да іх штодзённага ужываньня, што неяк не зварочваем увагі на тое, што яны зроблены з матар'ялу прывезенага з далёкіх краінаў. А матар'ял гэты дарагі, каштуе шмат грошаў і яго не заўсёды нават магчыма купіць. Часамі яго нельга купіць за ніякія грошы.

Транспарт, сельская гаспадарка, мэдыцына, рэчы хатняга ужытку патрабуюць вялікай колькасьці каучуку, але сучасная індустрыя наагул не магчымая бяз гэтай сыравіны. Не апошняе месца займае таксама каучук сярод стратэгічных матар'ялаў. Калі у верасьні 1914 году немцы былі ўжо каля 35 кілёмэтраў ад Парыжу і вось вось мелі ўжо яго заняць, на дапамогу французам прыйшоў... каучук. Французы зразумелі тады, што толькі зараз-жа кінутыя у бой на рацэ Марне сьвежыя сілы могуць затрымаць немцаў. Хутка змабілізаваўшы увесь аўтамабільны транспарт і кінуўшы ў бой на гумовых колах 40.000 сьвежых ваякаў, французы абаранілі Парыж.

Падлічана, што на пабудову толькі аднаго вайсковага карабля трэба 75 тонаў, а на адзін танк 1 тону каўчуку.

Якая-ж колькасьць каучуку патрабавалася амэрыканцам для іх матарызаваных войскаў і паветранае флёты, каб выграць другую сьветавую вайну.

Сягоньня, больш як 50.000 розных рэчаў выробляецца з каўчуку. Колькі-ж на усё гэта расходуецца гэтай запраўды цудоўнай сыравіны. Каучук дабываецца з расьлінаў, якія растуць пераважна у гарачым, вільготным трапічным клімаце Паўдзённай і Сярэдняй Амэрыкі і вастравох Маляйскага Архіпэлягу. Паколькі пастаўшчыкаў каучуку мала, а расходуецца яго вельмі шмат, вынайшлі спосаб рабіць каучук штучна гэта так званы сынтэтычны каучук.

Мы зьяўляемся сьветкамі, як часта рэклямуюць гэты сынтэтычны каучук. Кажуць, што ўжо знойдзены танны спосаб вырабу адпаведнага гатунку штучнага каучука, які па сваіх тэхнічных якасьцях не адрозьніваецца ад натуральнага, а у паасобных выпадках зьяўляецца лепшым. Вядома, што чалавечаму гэнію няма граніц і што тэхнічныя якасьці сынтэтычнага каучуку могуць быць палепшаныя. Ведама аднак таксама, што да апошніх часоў, шмат якіх вырабаў зусім не магчыма зрабіць са штучнага каучуку, бо будучы зробленымі са штучнага каучуку яны зусім не адказываюць тым запатрабаваньням, якія ім стаўляюцца. Нам прыпамінаецца, як немцы у часе апошняй вайны хваліліся, што праблема каучуку імі поўнасьцяй вырашаная і што яны натуральны каучук замянілі сынтэтычным. У запраўднасьці-ж было відаць адваротнае, яны задыхаліся ад нястачы гэтай сыравіны і займаліся палаваньнем на асобаў, якія працавалі у галіне каучукаводзтва, таксама як цяпер Савецкі Саюз займаецца паляваньнем за людзьмі, якія працавалі ў галіне атамнай энэргіі.

Мы ня маем намеру сказаць, што сынтэтычны каучук прадукт мала вартасны. Бязумоўна штучны каучук таксама адгрывае вялікую ролю, толькі пры ужываньні штучнага каучуку да яго неабходна дамешываць натуральны каучук з расьлінаў. Кажучы інакш, натуральны каучук яшчэ доўгі час будзе адгрываць, як відаць, вядучую ролю у гумовай прамысловасьці.

Савецкі Саюз да самых апошніх часоў ня меў свайго каучука. Яны прабавалі разводзіць у сябе гэвэю і іншыя дрэвы з якіх шляхом падсочкі дабываюць малочны сок, з якога выробляюць каучук, але культура гэтых расьлінаў, нават на паўдні Савецкага Саюзу, была дзеля кліматычных умоваў немагчымай. Дзеля гэтага прыйшлося шукаць іншыя расьліны-каучуканосы. Ведамы цэлы шэраг расьлінаў, якія у сваіх сьцяблох, лісьцёх і карэньнях маюць каучук. Досыць сказаць, што каучук знаходзіцца нават у сонешніку, якім поўныя гароды і палі у Беларусі. Пытаньне аднак упіраецца ў колькасьць і якасьць каучуку, якую мае тая ці іншая расьліна. У выніку экспэдыцыйных працаў быў знойдзены шэраг расьлінаў-каучуканосаў, але надзею на высокую прадукцыйнасьць дала толькі адна расьліна, вельмі падобная да звычайнага усім вядомага адуванца. Гэтая расьліна з сям'і складанакветкавых — кок-сагыз (Compositae, Taraxacum Kok-Saghyz, Rod.) была знойдзеная у міжгорных далінах Цянь-Шаню (Казахстан), на вышыні больш 2.000 мэтраў над роўняю мора. Заставалася толькі вызначыць з адпаведнымі глебава-кліматычнымі умовамі для гэтай расьліны і папрацаваць над асваеньнем яе у культуры.

У 1933 годзе кок-сагыз быў прывезены у Беларусь і высаджаны на розных глебах. Аказалася, што ён вельмі успадабаў сваю новую бацькаўшчыну, а найбольш удалыя пасевы яго былі заўсёды на тарфяных глебах. Разьмеры газэтнага артыкулу дазваляюць толькі вельмі коратка сказаць аб гэтай расьліне. Утварэньне каучуку у кок-сагызе адбываецца ў лісьці, у малочным соку, але зьбіраецца каучук толькі у карэньнях. Да восені таго самага году пасеву, у карэньні набіраецца у сярэднім 8-12% каучуку, бяручы на вагу паветра-

Аб беларускіх вайсковых фармацыях

7 ліпеня г. г. Астроўскі выдаў адозву, у якой заклікае беларускую эміграцыю запісвацца дабраахвотнікамі ў беларускія вайсковыя адзьдзелы на карэйскі фронт.

Адозва гэтая, як сваёй формай, так і зьместам можа зрабіць на чытача ўражаньне, што Астроўскі запраўды атрымаў згоду ад Арганізацыі Задзіночаных Народаў (АЗН), амэрыканскіх і іншых уладаў на фармаваньне беларускіх вайсковых адзьдзелаў на іхных тэрыторыях.

Дзеля таго, што справа беларускага войска, у якой-бы то форме не было, мае вялікае значэньне ня толькі для нашае моладзі, а і для цэласьці нашага вызвольнага руху, лічым неабходным дакладней высьвяціць беларускай эміграцыі як стаіць сяньня справа нацыянальных фармацыяў і якія запраўдныя мэты меў Астроўскі пры прагалошаньні "мабілізацыі" беларусаў.

Вось-жа найперш што да АЗН, дык ня толькі што няма ніякай пастановы, а нават ня было ніякага і праекту аб фармаваньні нейкіх нацыянальных адзьдзелаў з эмігрантаў. Пытаньне гэтае магло-б паўстаць толькі тады, калі заходня-дэмакратычныя дзяржавы апынуліся-б у фармальнай вайне з СССР і ягонымі сатэлітамі. Прысутнасьць-жа СССР у АЗН выключае ўсякія магчымасьці падобных пастановаў. Што да паасобных дзяржаваў, дык яны, як сувэрэнныя народы, ў прынцыпе, маглі-б дазволіць на сваіх тэрыторыях чужынецкія нацыянальныя фармацыі, але ў практыцы такія рэчы праводзяцца толькі тады, калі такая дзяржава знаходзіцца ў стане вайны з датычнай дзяржавай, з выхадцаў якой фармуюцца нацыянальныя вайсковыя адзьдзелы. Гэтак, нпр. падчас першай сусьветнай вайны ў Італіі, Францыі і Расеі паўсталі Чэха-Славацкія і Польскія легіёны, але паўсталі толькі тады, калі Расея, Францыя і Італія ваявалі супроць Аўстра Вугоршчыны і Нямеччыны.

Гутарыць-жа сяньня аб фармаваньні беларускіх, украінскіх ці іншых нацыянальных адзьдзелаў, пакуль ніводная дзяржава ў сьвеце не ваюе з СССР, напроста дзіцячая фантазыя, ня маючая нікага зьвязку з разьвагай дарослага чалавека, ня кажучы ўжо аб палітыку.

Чужанецкія легіёны

Што да чужанецкіх легіёнаў, дык праўда, такія існуюць у некаторых дзяржавах і падчас мірнага стану, нпр. у Францыі, Гішпаніі, Бэльгіі... Але такія легіёны ня маюць нічога супольнага зь нейкімі нацыянальнымі фармацыямі ці нацыянальнымі легіёнамі. Чужынецкі легіён Францыі — гэта адна з часьцей францускага войска, з тэй розьніцай, што жаўнерамі яго зьяўляюцца чужынцы розных нацыянальнасьцяў пры камандным складзе францускім. Аб нацыянальных нейкіх адзьдзелах у гэтым легіёне няма й гутаркі.

Амэрыканскі чужанецкі легіён

Два гады таму адзін амэрыканскі сэнатар — Лодж падаў праект Сэнату аб заргаізаваньні Амэрыканскага чужанецкага легіёну з 25 тыс. чалавек, маючы на ўвеце уцекачоў розных нацыянальнасьцяў, г. зв. Д. П. Легіён гэты меў быць арганізаваны на ўзор францускага чужанецкага легіёну. Некаторыя вайсковыя амэрыканскія каманды ў Нямеччыне нат пачалі былі прапагаваць вярбоўку (былі навет афішы у некаторых консулятах ЗГА), але Кангрэс адкінуў праект Лоджа, і гутаркі аб Амэрыканскім чужанецкім легіёне спыніліся ўжо год таму.

Ізаляванае ці паадзіночнае прыймо ў розныя арміі

У вапошнюю сусьветную вайну некаторыя дзяржавы прыймалі чужынцаў у свае арміі, не зважаючы на тое, што яны не зьяўляліся іхнымі грамадзянамі, надаючы ім грамадзянства потым прысьпешаным парадкам.

Пасьля закончаньня вайны, а асабліва апошнімі месяцамі найбольшыя магчымасьці ў гэтым сэнсе дае Амеэрыканская Армія.

Такія паадзіночна ізаляваныя выпадкі прыйма ў Амэрыканскую Армію чужынцаў вядомыя нашым эмігрантам у Нямеччыне, а цяпер і ў самой Амэрыцы.

Два месяцы прыблізна таму Амэрыканскі Кангрэс (відавочна, каб аблегчыць фармальнасьці для набору чужынцаў) прыняў закон, дазваляючы набор 2.500 чужынцаў у Амэрыканскую Армію. Згодна гэтага закону будуць прыймацца чужынцы векам ад 18 да 35 гадоў, але толькі нежанатыя (бесьсямейныя) і маючыя адпаведную асьвету. З гэтых 2.500 чужынцаў ня будзе тварыцца нейкая асобная вайсковая адзінка, а будуць яны падзеленыя па розных асобных адзьдзелах Амэрыканскае Арміі. З гэтых дабраахвотнікаў прадбачаецца падрыхтаваць не звычайных жаўнераў; а людзей, здольных быць правадцікамі і дарадчыкамі ў выпадку акупацыі Амэрыканцамі краінаў, зь якіх паходзяць гэныя дабраахвотнікі.

Дык вось як на сяньня прадстаўляецца справа войска.

Коратка кажучы, на сяньня беларускія вайскоўцы маюць толькі такія магчымасьці стацца актыўнымі жаўнерамі:

1) Прыехаўшым у Амэрыку ДП вельмі лёгка ўступіць дабраахвотнікам у Амэрыканскую Армію.

2) Згаласіцца бадраахвотнікам у Амэрыканскую Армію на падставе закону Кангрэсаў аб наборы 2.500 чужынцаў, незалежна ад краіны, дзе вы пражываеце. У гэтым выпадку трэба зга лошвацца да бліжэйшых Амэрканскіх камэндатураў або кансулятаў.

3) Уступіць дабраахвотнікамі у якісь чужынецкі легіён.

Магчыма яшчэ ў зьвязку з вайной у Карэі як Амэрыканскія, так і іншыя Арміі ў Эўропе ня будуць ставіць вялікіх перашкодаў для такіх ізаляваных прыймоў дабраахвотнікаў для ўключэньня іх у свае часьці на Карэйскі фронт.

Вось гэта і ўсё. Ніякіх пастановаў на фармаваньне нейкіх нацыянальных адзьдзелаў ні ў ваднэй дзяржаве Заходня - Дэмакратычнага блёку на сяньня **няма.** Ня выключана што з разьвіцьцём падзеяў паўстануць магчымасьці і на фармаваньне нацыянальных адзьдзелаў. Але гэтая справа **будучыні,** аб якой сяньня можна толькі дапускаць, можна нешта ў гэтым сэнсе праектаваць, але ні ў якім разе прадстаўляць, як нешта ужо рэальнае.

Да ўсяго гэтага такая важная справа, як фармаваньне нацыянальных адзьдзелаў, вымагае перадусім дакладнага аб гавораньня і ўкладзеньня адпаведнай умовы зь дзяржавамі, якія згодзяцца на фармаваньне такіх нацыянальных вайсковых адзьдзелаў, і то як у сэнсе іх матар'яльнага забясьпечаньня, так і найбольш эфэктоўнага іх выкарыстаньня ў сэнсе стратэгічным.

Свавольны заклік сп. Астроўскага "на Карэйскі фронт!" з падачай ім адрысу ягонага "гэнэральнага штабу" "Швайцарыя", дэмагагічныя выкрыкі "я ў першых радох з вамі!", "камандзіраў паасобных вайсковых злучэньняў вызначу асобна!", "Да зброі, да зброі браты!" і ўся іншая фантастычная бутафорыя робіць уражаньне напроста зьдзецінелага чалавека.

Гэтак заклік Астроўскага і быў спатканы беларускай эміграцыяй.

Было-б адылі вялікай памылкай бачыць у закліку Астроўскага адну толькі "дзяцінаду". Заклік гэты крыіць у сабе штосьць глыбейшае. І гэтае "глыбейшае", пры добрай розвазе, ня так ужо глыбака схавана.

Няма ніякага сумлеву, што Астроўскі, выпускаючы заклік і "загад" аб "мабілізацыі" беларусаў, дасканальна ведаў, што ніякіх нацыянальных беларускіх фармацыяў ніводная дзяржава Заходніх Дэмакратыяў на сваіх тэрыторыях не дазволіць, нават хоць-бы і для адпраўкі іх на карэйскі фронт. Доказам таго, што Астроўскі гэта добра ведаў, зьяўляецца фальшывы адрыс ягонай "рэзыдэнцыі" — "Швайцарыя". Як ведама, Астроўскі сядзіць і далей у Нямеччыне, свайго адрысу ў якой не паважыўся даць у сваім "закліку".

Выпушчаючы такую адозву і "загад", Астроўскі меў выразна на меце скампраміта ваць беларускую эміграцыя ў ваччу заходня-дэмакратычных народаў, пасеяць і ўкараніць узаемны недавер паміж беларускай эміграцыяй і заходня-дэмакратычнымі ўладамі.

Астроўскі разьлічваў:

1) на магчымую наіўнасьць беларускай вайсковай моладзі, якая, дзякуючы сваёй пацязе да беларускага войска і антыбальшавіцкаму настрою, шугне масова да "вярбовачных бюраў" БЦР, паверыўшы, што яна запраўды запісваецца ў беларускія нацыянальныя фармацыі. У такім-бы выпадку правакацыя Астроўскага поўнасьцю дапяла свае мэты, бо пэўне-ж выявілася-б хутка, што на ніякія беларускія фармацыі дазволу няма, а што адзіная магчымасьць — гэта уступіць паадзіночна ў іншанацыянальныя арміі. Зразумела, што Астроўскі ніколі ня прызнаўся-б зьявіўшымся да яго дабраахвотнікам, што ашукаў іх ён, пэўне-ж праз сваіх падручных зваліў-бы віну на амэрыканцаў і на АЗН, што ашукалі яго (Астроўскага) яны. У выніку гэтага сярод беларускай моладзі паўстала-б крыўда і ненавісьць да ўладаў, якія у такі ашуканчы спосаб хацелі іх заманіць.

Такі-б вытвараны настрой недаверу, бясспрэчна, быў-бы ў будучыні вельмі карысны бальшавіком, бо ў выпадку (што зусім магчыма), калі-б запраўды былі дазволеныя беларускія вайсковыя фармацыі, моладзь наша, зразумела, аднеслася-б да іх зь недаверам і без энтузіязму, бо калі ўжо ашукалі першы раз, то якая гварантыя, што не ашукаюць іх ў якісь іншы спосаб і другі раз.

Гэта першы выпадак, зь якога-б мелі карысьці нашыя ворагі бальшавікі.

2-гі выпадак. **Уявім** сабе, што на заклік Астроўскага "дапамагчы саюзьнікам у змаганьні з найзьлейшым ворагам людзтва, бальшавізмам" — ніхто зь беларусаў не адгукнуўся (што фактычна так і сталася). У такім вось выпадку Астроўскі, бязумоўна, ня будзе нікому і нідзе тлумачыць, што сталася гэта з прычынаў недаверу і антыпатыяў да асобы Астроўскага, а пэўне-ж будзе апраўдвацца тым, што беларуская эміграцыя засталася глухой да ягонага закліку дзеляттаго, што ня хоча змагацца з бальшавізмам, што яна знаходзіцца ў нейкіх варожых дэмакратыі руках, значыцца — нельга лічыць на беларускую эміграцыю, нельга ёй верыць.. Словам, усё як "па нітачцы" тых сакрэтных інструкцыяў Масквы — кампраміта ваць эміграцыю ў ваччу заходніх дэмакратыяў.

3-ці выпадак. Прыпусьцім сабе, што Астроўскі разьлічваў яшчэ і на тое, што сабраўшы сьпісы дабраахвотнікаў, хоць і ашуканствам, і зьявіўшыся потым з гэнымі сьпісамі да Амэрыканцаў, ён дамажацца дазволу для адпраўкі іх на карэйскі фронт, як беларускія ці паўбеларускія групы. І ў гэтым выпадку была-б ня меншая прыслуга бальшавіком, бо адцягненьне нашага актыву на так далёкі ўсход было-б спаткана Масквой з аблягчаючым уздыхам. Бо чым сяньня запраўды небясьпечна і страшна бальшавіком беларуская эміграцыя, дык гэта магчымасьцяй выкарыстаньня яе заходнімі дэмакратыямі супроць бальшавікоў **на беларускім фронце.**

Такім чынам, заклік Астроўскага, як бачым, не такі ўжо

(Працяг на бал. 4-й)

на сухога карэньня. Пасьля некалькіх гадоў працы над агратэхнікай кок-сагызу, адзін гэктар кок-сагызу даваў 60 цэнтнэраў сухога карэньня — 200 кілёграмаў каучуку. Апрача таго у карэньнях кок-сагызу знаходзіцца інулін, з якога апрача каучуку магчыма атрымаць каля 500 літраў звычайнага (этылёвага) сьпірту.

Паколькі у Савецкім Саюзе ўсё робіцца на добравольна-прымусовых падставах, дык цэлы рад калгасаў павінен быў у гэтым дабравольна-прымусовым парадку засяваць коксагыз.

Падаем тут афіцыйныя даныя зь чатырох калгасаў сеяўшых кок-сагыз у 1939 годзе.

Калгасы	Пасевы у гэкт.	Уражай карэньня у цэнтнерах з 1га	Сабрана насеньня у кілегр. з гэктара	Прыход ад коксагызу у рублёх
13 год Кастрычніка Рагачоўскі раён	9,5	50,7	43,7	89165
Шлях Ільіча Старадарожскі раён	11,6	24,5	85,3	97078
Чырвоная Дуброва Рагачоўскага раёну	5,0	37,5	32,0	30898
Будаўнік Жлобінскага раёну	2,0	24,0	50,0	10303

напяўна калгасьнікі не узбагаціліся і ад гэтай культуры. Падругое культура кок-сагызу зьяўляецца нават досыць працаёмкай культурай і сяляне ня маюць яшчэ дасьветчаньня у гэтай працы. Дзеля гэтага зацікаўленасьці тут, як і наагул у усёй працы, мясцовае насельніцтва ня мае. Наадварот калгасьнікі усімі праўдамі і няпраўдамі стараюцца пазбавіцца ад гэтай вельмі каштоўнай культуры, якая робіць ім толькі лішні клопат.

Кок-сагыз у тым стане у якім ён цяпер культывуецца, зьяўляецца у сутнасьці дзікай расьлінай, гэтак званай складанай папуляцыяй, яшчэ ня вызначаных формаў. Ужо пры каучуку у ім. Тут назіраецца вельмі значная разпятасьць хістаньня. Праводзячы падбор па простых паказчыках са стасаваньнем размнажэньня эгзэмпляраў якія адзначаюцца добрымі простымі паказчыкамі і праз скрыжаваньне у хуткім часе стала магчымым у значнай ступені павялічыць прадуктыўнасьць гэтай расьліны. Павялічэньне кораню кок-сагызу на вазе у дзесяць і больш разоў ад пачатковае сярэдняе вагі не зьяўляецца вынятквм. Працэнтовасьць каучуку у корані т а к с а м а павялічылася удвая і больш.

Сказанае тут пра гэтую расьліну напамінае нам пачатак працы з цукровым бураком. Усім ведамая якую карысьць у народнай гаспадарцы розных краінаў адыгрывае цукровы бурак. Мы спадзяемся ня меншага ад кок-сагызу.

Гэтае аднак будзе магчымым толькі тады, калі у Беларусі гаспадаром палёў будзе селянін, калі ён перастане быць тым нявольнікам, якім ён зьяўляецца сягоньня. Трэба каб селянін быў зацікаўлены у сваёй працы. Калі ад селяніна ня будуць адбіраць дарма прадуктаў ім вытвараных, калі ён ня будзе стаяць перад страхам раскулачаньня і ссылкі у Сібір, тады кок-сагыз зойме належнае яму месца сярод сельска - гаспадарчых культураў і Беларусь будзе мець свой уласны каучук у дастатковай колькасьці.

Трэба сказаць, што наагул да лічбаў публікаваных у Савецкім Саюзе трэба падыходзіць з вялікай асьцярожнасьцяй і гэты прыбытак можа ня быць аблічаны дакладна, але адно толькі эразумела, што павярхоўным агл ядзе кідаецца у вочы яскравая розніца ў форме лістоў паасобных эгзэмпляраў. Пры больш дэталёвым аглядзе магчыма канстатаваць розніцу у простых паказчыках: вялічыні кораня і процанту

М. Д

БЕЛАРУСЫ У СЬВЕЦЕ

БЕЛАРУСКАЕ СТУДЭНЦТВА АРГАНІЗУЕЦЦА

У нядзелю 26 жніўня ў "Беларускай Хатцы" ў Брукліне (частка Нью-Ерку) адбыўся зьезд беларускіх студэнтаў і матурыстых. Прыняты статут і выбраны урад. Арганізацыя абыймае каля 50 сяброў. Мэта арганізацыі: самадзейная культурна-асьветная праца, здабыцьцё матар'яльных магчымасьцяў для студыяў ў вышэйшых школах і ўтрыманьне цясьнейшай сяброўскай сувязі.

Прынята пастанова ўвайсьці ў склад ЦБАА.

АРГАНІЗАЦЫЙНАЯ СХОДКА НАВУКОЎЦАЎ

26 жніўня адбылася арганізацыйная сходка беларускіх навукоўцаў, паэтаў, пісьменьнікаў і мастакоў, пражываючых ў Нью-Ерку і ваколіцах. Прысутнічала каля 20 асоб. Пастаноўлена зарганізаваць "Беларускую Вольную Акадэмію Навукаў і Мастацтваў". Выбраны тымчасовы ўрад, які мае падрыхтаваць статут і апрацаваць плян працы.

З АРГАНІЗАЦЫЙНАГА ЖЫЦЬЦЯ

Беларуска-Амэрыканскае Задзіночаньне расьце і ўзмацняецца

За апошніх 3 месяцы стараньнямі БАЗА прыехала у ЗГА зь Нямеччыны каля 200 сем'яў, сярод якіх б. прэм'ер вонкавых справаў — сп. А. Каханоўскі, гэн. Ф. Кушаль, паэтэса Н. Арсеньнева, пісьменьнік А. Адамовіч, мастак П. Мірановіч, камп. М. Куліковіч з цэлай трупай свайго тэатру, камп. А. Каптуровіч і [illegible] іншых выдатнейшых палітычных і культурных дзеячаў.

РАЗРОСТ АДЗЬДЗЕЛАЎ БАЗА

Клевэлянд

Год таму па Клэвэляндзе блудзіў адзін-аднюсенькі беларускі юнак сп. М. Белямук. Ягоныя лісты да цэнтралі былі поўныя горачы і пэсымізму. Сяньня клэвэлянскі адзьдзел перайходзіць ужо за 50 сяброў, у бальшыні такіх-жа палкіх юнакоў і патрыётаў, як і Белямук. Чакаюць прыезду іншых. Пішуць што адзьдзел іх хутка дайдзе да 100 сяброў. Іх актуальныя праблемы: арганізацыя прыходу БАПЦ (сьвятара ўжо маюць) і купля беларускага дому.

Саўт - Рівэр

У невялічкім мястэчку Саўт-Рівэр, Нью-Ерскага стэйту, якое мела стацца "сталіцай" збанкрутаваных недабіткаў зарубежжа, пачаў разрастацца адзьдзел БАЗА, на чале з старшыней сп. Ф. Родзькам. Адзьдзел гэты хоць яшчэ сваей колькасьцю і не перарос усяго скупчанага у адзін "Кулак" зарубежжа, але сваей саліднасьцю і павагай у мяйсцовага жыхарства ён ужо даўно перарос гэтую "дзяржаву БЦР".

Бруклін

Бруклінскі адзьдзел БАЗА, з інтыятывы Задзіночаньня Беларускіх Жанчын, зарганізаваў "Беларускую Хатку", якая цяпер стала цэнтрам сходак і забаваў ня толькі для бруклінскага адзьдзелу, а й для суседніх адзьдзелаў як Маспэт, Мангэтэн і інш.

Першы прыход БПАЦ у ЗГА.

У нядзелю 26 жніўня быў выбраны Беларускі Царкоўны Камітэт. Прыехалі два сьвятары БПАЦ. У бліжэйшыя нядзелі распачнуцца Багаслужбы.

Чыкаго

На гэтых днёх да беларускай калёніі Чыкаго прыехаў з сям'ей сп. БУДЗЬКА Эдуард. — вэтэран беларускага вызвольнага руху; Нашанівец, удзельнік І-га Усебеларускага Кангрэсу, сябра Рады БНР з 1917 г.

Сп. Э. Будзька, ня гледзячы на так доўгае падарожжа і свой так паважны век, пры высадцы ў Нью Ерку пачуваўся вельмі бадзёрым. Беларуская калёнія Н. Е. гасьціла ў сябе сп. Будзьку 4 дні і ўсе былі захоплены ягонай энэргіяй і рухлівасьцю. Сп. Будзька працуе над праектамі пабудовы беларускіх вёсак і мястэчак, таму ён найбольш цікавіўся, пры сваіх экскурсыях, амэрыканскай архітэктурай. Меў так сама даўжэйшую размову з прэз. М. Абрамчыкам.

З НАВУКОВАЕ Й КУЛЬТУРНА-АСЬВЕТНАЕ ПРАЦЫ У НЬЮ ЕРКУ

У 32-ія ўгодкі абвешчаньня Незалежнасьці Беларускае Народнае Рэспублікі адбылася ў Нью Ерку акадэмія. Яна прайшла вельмі ўрачыста, зь вялікім энтузіязмам. Рэфэрат на тэму угодкаў прачытаў інж. М. Рагуля. Прадстаўнікі іншых народаў: украінцаў, славакаў, казакаў і адзін амэрыканец — віншавалі беларусаў з іхным вялікім сьвятам.

***

23-га красавіка г. г. інж. Мікіта Кэкало, украінец, прачытаў рэфэрат на тэму: "Салавецкія канцэнтрацыйныя лягеры і беларускія спэцперасяленцы ў Паўночным Краі"

Найважнейшыя дадзеныя з гэтага рэфэрату былі пададзены ў прэсавую агенцыю і іх паўтарылі шмат якія газэты.

***

У студзені й чэрвені адбыліся два літаратурныя вечары з удзелам на адным сп. сп. Я. Юхнаўца, У. Клішэвіча й Я. Шакуна і на другім — Н. Арсеньневай, Я. Юхнаўца і Я. Шакуна. Аўтары чыталі свае недрукаваныя йшчэ творы. Вершы Арсеньневай дэклямавала артыстка Беларускага Тэатру Эстрады сп. І. Жылінская.

***

У моваведнай сэкцыі Украінскай Вольнай Акадэміі Навук праф. Я. Станкевіч прачытаў рэфэрат на тэму: "Паходжаньне й нормы гаспадарстваваемовы Вялікага Княства Літоўскага".

Рэфэрат паказаў, што гаспадарствавая й літаратурная мова задзіночанага беларускага гаспадарства, званага Вялікім Княствам Літоўскім была мовай беларускай. Украінскія моваведы прызналі, што рэфэрат быў аб'ектыўным й абапёрты на навукова скансгатаваных моўных фактах.

***

У 1950 г. праф. Я. Станкевіч прачытаў наступныя рэфэраты: 1) Беларускія плямёны і іхныя гаспадарствы; 2) Першы пэрыяд гісторыі Беларусі; 3) Палітычны й культурны стан беларускіх плямёнаў; 4) Паўстаньне задзіночанага беларускага гаспадарства (XIII ст.); 5) Магутнасьць задзіночанага беларускага гаспадарства (1315 - 1475); 6) Нягодная каньюнктура для беларускага гаспадарства (1475-1580).

***

15-га ліпеня ведамы Беларускі Тэадр Эстрады, пад кіраўніцтвам камп. М. Куліковіча, даў у Нью Ерку канцэрт вар'етэ, на якім было паказана: беларускія народныя песьні і рамансы пры харавым і салёвым выкананьні, беларускія народныя танцы, акрабатыка і розныя камічныя нумары. Спэктакль меў вялікі сукцэс. Нашыя прафэсыянальныя артысты былі гэтак-жа горача вітаныя Нью Ерскай публікай, як гэта іх заўсёды віталі ў Эўропе.

***

2-га верасьня камп. М. Куліковіч прачытаў лекцыю на тэму: "Беларуская народная песьня". У перапоўненай залі лекцыя выклікала глыбокае зацікаўленьне. Былі падкрэсьлены чатыры мамэнты, што надаюць вялікую вартасьць беларускай народнай песьні і робяць ей славу ў сьвеце: 1) старавечнасьць яе мэлёдый, 2) арыгінальнасьць, 3) высока-мастацкая якасьць і 4) глыбіня зьместу.

У другой частцы дакладу былі прадэманстраваны ўзоры беларускай народнай песьні пры выкананьні ведамай нашай артысткі-салісткі сп-ні Б. Вержбаловіч пад акампаніямэнт піяніна камп. Куліковіча. Публіка шчыра надзяліла апладысмэнтамі дакладчыка й артыстку.

АЎСТРАЛІЯ

Яго Высока Прэасьвяшчэнства, Прэасьвяшчэнейшы Уладыка СЕРГІЙ прыехаў да Аўстраліі.

Радакцыя "Беларуса" ад імя усяе беларускае эміграцыі ў ЗГА жадае Яго Высокапрэасьвяшчэнству сілы і здароўя на новай зямлі, для службы Сьвятой Беларускай Праваслаўнай Аўтакефальнай Цэрквы.

У Брысбане (Аўстраліі) паўстала Задзіночаньне Беларускіх Камбатантаў. Старшыней Задзіночаньня сп. Д. Яцкевіч.

ФРАНЦЫЯ

"Беларускія Навіны" зноў пачалі выходзіць.

Пасьля доўгага перапынку "Бел. Навіны", што былі першай беларускай газэтай у вольным сьвеце пасьля вайны, зноў пачалі выходзіць. Газэта гэтая цяпер друкуецца ў собскай друкарні, якую сабе купіла Беларуская Выдавецкая Супалка ў Парыжы.

АРГЕНТЫНА

16. 9. г. г. беларуская калёнія Буэнос Айрэсу гуляе вясельле свайго старшыні сп. Мерляка Канстантына з спадарычняй Губэрт Ганнай. Маладой пары зычым шчасьлівага сямейнага жыцьця.

БЕЛАРУСЫ У БЭЛЬГІІ

Новыя беларускія лекары і інжынеры

У гэтм годзе у Лювэнскім унівэрсытэце мае быць выпушчана некалькі беларускіх лекараў і інжынераў, якія цяпер складаюць апошнія экзаміны.

Прадбачыцца, што на наступную восень колькасьць беларускіх студэнтаў у Лювэнскім унівэрсытэце ўзрасьце да 50 асобаў.

ДА АГУЛЬНАГА ВЕДАМА

На шматлікія запытаньні ці сп. Язэп Варонка зьяўляецца сябрам Рады БНР. падаецца да агульнага ведама, што Сэсія Пленарнага Паседжаньня Рады БНР паварот сп. Я. Варонкі у сябры Рады БНР не апрабавала.

Прэзыдыюм Рады БНР.

БЕЛАРУСЫ У АНГЛІІ

Вясна і лета гэтага году былі адзначаныя інтэнсыўнай працай беларускіх арганізацыяў у В. Брытаніі.

26 сакавіка адбыўся агульны зьезд Згуртаваньня Беларусаў Вялікай Брытаніі. У пазьнейшых тэрмінах адбыўся зьезд Беларускіх Камбатантаў у Вялікай Брытаніі і зьезд сяброў Беларускага Народна Хрысьціянскага Руху.

Апрача гэтага беларусы прыймалі удзел у чатырох між народных зьездах:

1) Журналістых цантральна-усходняе Эўропы.

2) Зьезд фэдэралістых.

3) Зьезд Антыбальшавіцкага Блёку Народаў.

***

У Вялікай Брытаніі існуе Міжнародны Каардынацыйны Камітэт для абароны інтэрэсаў уцекачоў. Да гэтага камітэту належыць 11 народаў цэнтральнай і усходняй Эўропы. Старшынства у гэтым камітэце адбываецца па чарзе. Цяпер пры пала якраз кадэнцыя беларускага прадстаўніка. Беларускі прадстаўнік а. др. Ч. Сіповіч зьяўляецца цяпер старшынёю гэтага камітэту.

З ЦАРКОЎНАГА ЖЫЦЬЦЯ

Уладыка Васіль, епіскап Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы, аб'ехаўшы нядаўна беларускія калёніі ў Бэльгіі, дзе ён быў з вялікім уздымам спатыканы беларусамі і з вялікай пашанай чужынцамі, аб'ехаў у ліпені месяцы беларускія асяродкі у Англіі. Падчас свайго пабыту там уладыка Васіль высьвяціў на сьвятара Аляксандра Крыта, беларускага дзеяча, галоўным чынам на ніве асьветы. Беларуская Аўтакефальная Праваслаўная Царква прыдбала яшчэ аднаго сьвятара шчырага, ахвярнага і адданага свайму народу. Вітаем айца Аляксандра і жадаем яму сілаў і здароў'я на многія годы, для службы Беларускаму Народу на духоўнай ніве.

Беларуска - украінскі канцэрт

У ДП лягеры Зээдорф у Нямеччыне 30 ліпеня г. г. ад імені ІМКА быў арганізаваны беларуска-украінскі канцэрт. На праграму канцэрту зляжыліся салёвыя сьпевы ў выкананьні сьпевакоў Юрага Сенькоўскага (беларускія) ды Юрага Тамарчэнкі (украінскія). Сьпяваліся песьні народныя і песьні кампанаваныя. Значная частка іх гэта творы нашага кампазытара праф. Алеся Карповіча.

Сам праф. Карповіч акампаніяваў да сьпеву і арыграў дзьве собскія кампазыцыі для фартапіяна — "Прэлюдыя" і "Токато". З беларускае праграмы асаблівую ўвагу зьвярнулі на сябе новыя творы праф. Карповіча — песьня "Драўляны дом" і кампазыцыі народных песьняў "Пальночак" ды "Лявоніхі" для дуэтнага сьпеву.

Прысутныя, пераважна жыхары лягеру беларусы ды украінцы, шчырымі воплескамі абдарылі мастакоў за першараднае выкананьне праграмы.

АБ БЕЛАРУСКІХ ВАЙСКОВЫХ ФАРМАЦЫЯХ

(Працяг з бал. 3-й)

сабе пусьценькі, бессансоўненькі блеф, а добра прадуманая і ўплянованая правакацыя, мэта якой, куды ні павярні, усё на карысьць Масквы. І гэтая плянаваная дывэрсыйна - правакатарская праца Астроўскага выяўляецца ня толькі сяньня зь ягонага закліку "у Карэю", і пэўне-ж на гэтым закліку і ня скончыцца, хоць канец яе не так ужо далёкі, і канец ганебны.

Хто яшчэ паважна не задумваўся над "акцыяй" "Астроўскага" у цэласьці, сьлепа ўблытаўшыся ў яе, хай добра ПЕРАДУМАЕ, пакуль ня позна.

Вайскавік

ЗАКІК ДА БЕЛАРУСАЎ У З. Д. А.

Дарагія суродзічы!

Звыш году назад у Нью Ерку паўстала беларская арганізацыя пад назовам: Беларуска - Амэрыканскае Задзіночаньне у З. Д. А.

Арганізацыя гэтая мае ўжо сёньня шэсьць аддзелаў у розных мясцовасьцях. Першы раз у гісторыі беларускай эміграцыі у З. Д. А. так хутка разьвіваецца беларускае жыцьцё — узносіцца сьцяг Беларуса сярод амэрыканскага народу. З другога боку сумнай зьяваю зьяўляецца тое, што нашыя браты, старэйшыя эміграны, якіх налічваецца у З. Д. А. некалькі сотняў тысяч, і надалей належаць яшчэ да чужых, не беларускіх арганізацыяў.

Пакінуўшы родную зямельку вы часта ў тузе па ёй, па сваіх родных, знаёмых йшлі да арганізацыяў суседніх нам народаў, каб даведацца нешта аб сваім краю і нат' часта, каб памагчы яму. Але гэтыя суседзі выкарыстовывалі вас для сваіх собскіх мэтаў, намагаючыся усімі сіламі утрымаць вас тут, як калісь дома у вабмыле.

Гэтак было, гэтак ёсьць яшчэ й сягоньня, але гэтак не павінна быць далей.

Аглянецеся, дарагія браты, навокал. Расчынеце шырэй [illegible]чы, падумайце над тым, як в[illegible] ашуківалі і ашуківаюць, шко[illegible] на для вас самых і сьмярот[illegible] шкодна вашым братом [illegible] Бацькаўшчыне.

У той час, калі твой родны брат, сваяк ці сусед змагаецца у барацьбе з акупантам за волю сваёй Бацькаўшчыны і крычыць на увесь сьвет просячы помачы, [illegible] розн[illegible] памочнікі і агенты гэнага акупанта упрэглі цябе да сваіх арганізацыяў, стараючыся заглушыць у табе голас беларускае душы.

Там у Беларусі акупант страляе, высылае у Сібір тва[illegible] родных і блізкіх, а ты тут дапамагаеш ягоным агентам. Ты памагаеш заглушаць крык і енк сваіх братоў тым, што памагаеш гэным тыранам сваім належаньнем да іхных арганізацыяў, сваёй грашовай помачу.

Задумайся, дарагі браце, які цяжкі грэх перад Беларускім Народам маеш ты на сваім сумленьні.

Прыйдзі да нас. Ідзі так як кожны народ да сваіх. Пакінь чужынецкія арганізацыі, пакінь вырадкаў нашага народу, пакінь агентаў тыранаў Беларускага Народу!

Прыйдзі да нашага Задзіночаньня. Пачуеш беларускую песьню, што табе пяяла калісь маці над калыскаю, пачуеш песьню беларускага ваякі-партызана.

Прыйдзі да нас, — пазнаеш нас і знойдзеш сябе.

Задзіночаньне месьціцца у Нью-Ерку, 325 East 100 Str., Apt. 9.

Беларуска Амэрыканскае Задзіночаньне

ЗЛАЖЫ АХВЯРУ НА БЕЛАРУСКУЮ ПРЭСУ!